З вопыту рэалізацыі інфармацыйна-адукацыйнага праекта
“ШАГ” у дзяржаўнай установе адукацыі “Дзяніскавіцкая
сярэдняя школа”
Ганцавіцкага раёна Брэстцкай вобласці

**Тэма: “Радзіма мая Беларусь у асобах.
Слаўныя імёны ў навуцы і адукацыі”**

**Мэта:** фарміраванне ў навучэнцаў кампетэнцый актыўнага грамадзяніна, пазіцыі грамадзянскасці і патрыятызму, актуалізацыя ведаў пра навуку і адукацыю Рэспублікі Беларусь.

25 студзеня ў рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта “ШАГ” для вучняў 8-10 класаў прайшоў чарговы занятак на тэму “Радзіма мая Беларусь у асобах. Слаўныя імёны ў навуцы і адукацыі” (пра дзеячаў навукі, прадстаўнікоў сістэмы адукацыі). Гасцямі мерапрыемства сталі ветэраны педагагічнай працы Новік Валянціна Цімафееўна, настаўнік пачатковых класаў ДУА “Дзяніскавіцкая сярэдняя школа”, і Зяленка Анастасія Паўлаўна, педагог сацыяльны ДУА “Дзяніскавіцкая сярэдняя школа”.




У пачатму мерапрыемства вучні абмеркавлі выказванне вялікага педагога В.А.Сухамлінскага: “Працу настаўніка ні з чым нельга параўнаць. Ткач ужо праз гадзіну бачыць вынікі сваёй працы, сталявар праз некалькі гадзін радуецца агнявому патоку металу, араты, сейбіт, хлебароб праз некалькі месяцаў любуюцца каласамі  і жменяй збожжа, якое яны выгадавалі ў полі. Настаўніку ж патрэбна працаваць годы, каб убачыць вынікі свайго тварэння”.

Прадоўжыўся занятак віктарынай “Мы даведваемся”, вучні давалі адказы на наступныя пытанні: якая роля адукацыі ў сучасным беларускім грамадстве, якія ўмовы створаны ў Рэспубліцы Беларусь для падтрымкі адоранай моладзі, што абазначае прынцып “адукацыя праз усё жыццё”, якія магчымасці для задавальнення творчых, даследчых зацікаўленняў навучэнцаў адкрывае ўстанова адукацыі “Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк”. Абмяркоўваючы і аналізуючы ўсе магчымыя адказы, вучні прыйшлі да высновы, што адукацыя разглядаецца як

вядучы фактар сацыяльнага і эканамічнага прагрэсу. Прычына заключаецца ў разуменні таго, што найважнейшай каштоўнасцю і асноўным капіталам сучаснай дзяржавы з'яўляецца адукаваны чалавек, здольны да пошуку і засваення новых ведаў і прыняцця нестандартных рашэнняў. Усё гэта робіць цалкам відавочны той факт, што ў вырашэнні найбольш вострых глабальных праблем чалавецтва велізарная роля павінна належаць адукацыі. Бо ўсе намаганні, накіраваныя на забеспячэнне і падтрыманне канкурэнтаздольнасці ў галіне асваення перадавых тэхналогій, без адукацыі будуць безвыніковыя.

Вучні зрабілі вывад, што якасная адукацыя, творчы і інтэлектуальны патэнцыял асобы – найважнейшыя каштоўнасці, на якія робіцца стаўка ў краіне.



Кожны чалавек у нашай краіне мае магчымасць рэалізаваць сябе ў абранай прафесіі. Госці нашага занятку Новік Валянціна Цімафееўна – настаўнік пачатковых класаў ДУА “Дзяніскавіцкая сярэдняя школа”, ветэран педагагічнай працы і Зяленка Анастасія Паўлаўна – педагог сацыяльны ДУА “Дзяніскавіцкая сярэдняя школа”, ветэран педагагічнай працы, выпускніца першага выпуску дзесяцігадовай школы ў вёсцы Дзяніскавічы ў 1966 годзе яшчэ раз пацвердзілі такую думку сваімі адказамі на пытанні вучняў. Пытанні былі розныя: ці сапраўды прафесія настаўніка асабліва важная ў нашым грамадстве; ці ёсць сакрэты прафесійнага майстэрства; што самае цікавае было ў школьным жыцці; што неабходна, каб стаць прафесіяналам сваёй справы; ці былі цяжкасці пры авалодванні прафесіяй настаўніка, якую ролю адыгрывае адукацыя ў патрыятычным выхаванні; якімі рысамі характару павінен валодаць настаўнік і інш. Госці цікава расказалі пра сваё жыццё, сваю працу, пра дасягненні, пра людзей, з якімі працавалі, пра сваіх вучняў. Адзначылі, што тэхналогіі не стаяць на месцы, узровень адукацыі павышаецца, удасканальваецца, таму, каб быць канкурэнтназдольным на рынку працы, патрэбна “ўмець” пастаянна вучыцца і падтрымліваць высокі ўзровень ведаў. Калі гасцям прапанавалі працягнуць фразу “Настаўнік – гэта…”, то і Валянціна Цімафееўна, і Анастасія Паўлаўна сказалі, што настаўнік – гэта прызванне. Шмат цікавых гісторый і ўспамінаў пачулі вучні ад нашых гасцей, усе атрымалі ад сустрэчы шмат пазітыву, шчырых слоў і парадаў. А напрыканцы размовы і Валянціна Цімафееўна, і Анастасія

Паўлаўна пажадалі і вучням, і настаўнікам якаснай адукацыі і творчага патэнцыялу асобы, бо гэта найважнейшыя каштоўнасці будучыні нашай краіны.

У ходзе абмеркавання вучні адзначылі, што ў некаторых з іх ёсць жаданне пайсці вучыцца ў педагагічным накірунку. Былі абмеркаваны пытанні пра магчымасць атрымання мэтавых накірункаў на вучобу.

А рэфлексіяй сустрэчы стала пытанне: апішыце адзін працоўны дзень педагога, выкарыстоўваючы толькі назоўнікі. Найбольш ужывальныя былі любоў, цярпенне, здароўе, сшытак, прывітанне, урок, тэма, аналіз, рашэнне, даследчык, дарадца, дапамога, заданне, выкананне, практыкаванне, чытанне, пісьмо, праверка, фізкультхвілінка і інш.

Паслухаўшы выступленні гасцей вучні прыйшлі да высновы, што важна памятаць, што не толькі высокія ўзнагароды і пасады сведчаць пра тое, што ўклад чалавека ў развіццё сваёй краіны варты высокай адзнакі. Штодзённая добрасумленная праца, клопат пра сваю сям’ю, актыўная грамадзянская пазіцыя, любоў да сваёй працы, Радзімы, павага маральных устояў – гэта тое, што характарызуе лепшых беларусаў.




Дасягненні ў розных галінах навукі і адукацыі даюць беларусам падставу ганарыцца сваёй краінай, сваімі людзьмі, якія імкнуцца зрабіць яе мацнейшай і багацейшай. Нашай краіне патрэбны адукаваныя, беражлівыя, высокакваліфікаваныя і граматныя спецыялісты, усім сэрцам адданыя працы на карысць сваёй Радзімы людзі.

Савеня Валянціна Канстанцінаўна,
класны кіраўнік 8 класа
ДУА “Дзяніскавіцкая сярэдняя школа”
Ганцавіцкага раёна
+375292317190